

1

# Дзівосны Іран

**Ларыса Фінкельштэйн**

Выстава «Дзівосны Іран», прымеркаваная да 44-й гадавіны перамогі Ісламскай рэвалюцыі ў Іране, экспанавалася ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Праект быў арганізаваны мастацкай галерэяй сумесна з Пасольствам Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь.

Адна з яскравых старонак традыцыйнага іранскага мастацтва — каліграфія. Зрэшты, у многіх усходніх народаў каліграфія складае асаблівую нацыянальную старонку культуры і паўсюль мае свае асаблівасці. У Іране каліграфія зарадзілася ў даісламскую эпоху, пра што сведчаць надпісы золатам на пергаменце, гравіроўкі на кераміцы, шматлікія надпісы ў Бісутоне, Басаргадах і іншых месцах. Кожная эпоха і кожная культура ўносілі ў іранскую каліграфію свае прыкметы. На выставе «Дзівосны Іран» нам былі паказаныя творы вядомага сучаснага іранскага каліграфа Масуда Махебі Фара (таксама ён займаецца станковым і манументальным жывапісам). Каліграфія гэтага мастака дае пэўнае ўяўленне пра тыповы від іранскага мастацтва. Калі-





графія, як вядома, не проста прыгожае напісанне літар, а цэлая філасофія, а таксама самавыражэнне мастака і характарыстыка яго асобы. Акрамя галоўнай камунікатыўнай, каліграфія мае эстэтычную, эмацыянальную, індывідуальна аўтарскую функцыі. У прыватнасці, Масуд Махебі Фар з усіх прыёмаў і спосабаў каліграфіі выбірае размову — і нават асобнымі словамі і фразамі, цэлымі вобразнымі паняццямі. Крыніцай натхнення для мастака выступаюць творы яго любімых паэтаў Амара Хаяма, Хафіза і іншых. Пластычная мова гэтага творцы заключаецца ў мяккіх мудрагелістых цякучых лініях і фрагментах расліннага характару. Да таго ж побач з жывым імпульсіўным малюнкам у яго кампазіцыях важную ролю грае колер: то цёмна-фіялетавы містычны, то сонечны залаты, поўны цеплыні і пяшчоты, то строгі, дасягнуты кантрастамі белага і чорнага.

Рукае Афза прадстаўляла на выставе сучасны жывапіс. Мастачка працуе ў еўрапейскай пейзажнай традыцыі, а таксама стварае нацюрморты, партрэты, сюжэтныя кампазіцыі рэалістычнага напрамку.

Таксама на «Дзівосным Іране» быў паказаны яшчэ адзін традыцыйны кірунак дэкаратыўнага мастацтва — тканіны ручной работы тэрме. Гэтая тканіна лічыцца самай мастацкай і выкарыстоўваецца ў адзенні, аксесуарах (сумкі), абутку, а больш за ўсё — у дэкаратыўных элементах інтэр'ера: абрусы, сурвэткі, фіранкі і гэтак далей. Яна тчэцца шаўковымі, ваўнянымі ніткамі з дадаткам срэбра і золата.

Іран лічыцца радзімай эмальернага мастацтва, якое потым распаўсюдзілася на іншыя краіны. І яно шырока было прадстаўлена на выставе. Эмаллю ўпрыгожваліся посуд, дэкаратыўныя вазы, разеткі. Вырабы гэтыя выконваліся з каштоўных металаў, пакрываліся каалінавай глінай, тройчы абпальваліся, і толькі потым на іх наносіліся роспісы эмаллю і замацоўваліся канчатковым абпалам. Усе яны адрозніваюцца тонкасцю малюнка і яго арнаментальным характарам. Такая тэхніка называецца мінакары. З часам, каб вырабы сталі таннейшыя, каштоўныя металы замянілі на медзь. Кераміка таксама дэкарыравалася ў гэтай тэхніцы, але на выставе былі прадстаўлены некалькі керамічных вырабаў, выкананых у белай гліне і пакрытых белай глазурай. Таксама можна было ўбачыць творы ручной работы, выкананыя ў кераміцы з сучаснай тэхнікай дэкаравання спосабам паліванай глазуры.

У традыцыях іранскага прыкладнога мастацтва прадстаўлены інкруставаныя драўляныя вырабы, пераважна з геаметрычным малюнкам.

Візітоўкай прыкладнога мастацтва любога народа з'яўляецца касцюм. На выставе наведвальнікі маглі назіраць мадэлі не аўтэнтычныя (на манекенах), а зменшаныя і надзетыя на лялькі. Але гэта дало магчымасць прадэманстраваць цэлую палітру іранскага касцюма. Традыцыйныя тканіны, традыцыйныя колеры і іх спалучэнне, а таксама характэрныя аксесуары: галаўныя ўборы, шалікі, паясы, абутак — усё гэта вытанчана выкананае і склала цікавую ды пераканаўчую карціну нацыянальнага адзення. Ⓜ

1 ▪ Каліграфія Масуда Масхебі Фара.
2 ▪ Іран — радзіма эмальернага мастацтва.
3 ▪ Рукае Афза, сучасны жывапіс.